# «Мой выбар — пераадоленне»

**Наталля Прыступа. Гэтае імя ў канцы дзевяностых — пачатку двухтысячных было вядома ў шырокіх паэтычных колах не толькі Беларусі, але і Расіі. Яе вершы друкаваліся ў калектыўных зборніках «Надзея», «Памяць аб крылах», «Лёгкіх карункаў чароўная чарада», у альманахах «Дзень паэзіі», «Гоман», «Берасцейскія карані», «Піншчына літаратурная», «Берагі Таўрыды», «Сустрэча» (Барнаул), у часопісах «Нёман», «Першацвет», «Акно», «Белыя снегіры» (Масква).**



*Наталля Прыступа.*

А потым у далёкім 1996 годзе выйшаў першы зборнік вершаў Наталлі з сімвалічнай назвай «Спроба». Спроба заявіць аб сабе смела, упэўнена, ва ўвесь голас аказалася вельмі ўдалай. Яе паэзія прымалася чытачамі, знаходзіла водгук у іх сэрцах, і здзіўляючы, і захапляючы. У Н. Прыступы свой стыль, індывідуальны, не падобны на іншыя. Даследуючы паэзію Наталлі, вядомы літаратурны крытык, зямлячка Валянціна Локун адзначала, што яе творчасць «балансуе на мяжы рэалізму і мадэрнізму, лірыкі і інтэлектуалізму. Яе вершы метафарычныя і асацыятыўныя».

З прафесійнай ацэнкай наўрад ці трэба спрачацца. Лепш проста ўзяць збор-

гутарка. Дзяўчына расказала пра сябе. Родам з вёскі Малоткавічы, што недалёка ад Пінска. Бацькі — служачыя. Скончыла Рэчыцкую спецшколу-інтэрнат для інвалідаў. На момант сустрэчы знаходзілася ў Пінску ў Доме міласэрнасці.

Каб не бянтэжыць суразмоўніцу, крад-

*Болею жизнью.*
*Гибну. Каюсь.*
*И каждый день в неё*
*влюбляюсь!*

Валодаючы выдатным паэтычным дарам, Наталля Прыступа не адмаўляла ў дапамозе пачаткоўцам. Яна з задавальненнем адгукнулася на маю просьбу быць літкансультантам «Пінскага весніка» і працавала з аўтарамі цярпліва і добразычліва. Маючы добрае сэрца, будучы вельмі даверлівай, дазваляла быць з ёй побач не заўсёды прыстойным людзям, якія выкарыстоўвалі яе талент у сваіх мэтах. Яна адчувала гэта, разумела і тым не менш прымала. Можа, таму неяк і напісала:

*В выборе судьбы была вольна.*
*Жить учила белая луна.*
*Как душе моей среди людей,*
*В чёрном небе одиноко ей.*

У 2005 годзе Наталлю Прыступу прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Яна вельмі радавалася гэтаму. І працягвала ствараць, рыхтавала да выпуску чарговую, як аказалася, апошнюю кнігу. Давала мне на вычытку свае вершы. Я працавала над імі з нейкім пакуль што незразумелым і ведала напэўна, аб чым яно баліць. Яна спазнала вялікае пачуццё, названае Каханнем. І такую ж па велічыні здраду.

*Уходишь в дождь.*
*Не держишь слово снова.*
*И я прощать всё менее готова.*
*Стучится в окна дождь...*
*Тебе не больно?*
*Что делать нам*
*с живой ещё любовью?*

Яно, гэтае жывое каханне, было ў яе сэрцы да апошняга. Неасцярожныя дзеянні ў адносінах да яе нечакана для ўсіх абарвалі яе жыццё ў самым росквіце — у 47 гадоў. Апошняя кніга «У абдымках лёсу» выйшла ў 2006 годзе пасля ўжо смерці Наталлі. І таксама была запатрабавана чытачамі, як і ўсе папярэднія.

Гэтыя паэтычныя радкі — з Наташынага апошняга зборніка:

*Прельстится одиночество*
*видением утроенным.*
*Как сердцу без поэзии?*
*Классичен ритм и нов.*
*Роскошно, неожиданно*
*на трельяже устроилось*
*малиновое облако*
*неузнанных цветов.*

ба спрачацца. Лепш проста ўзяць зборнікі вершаў і чытаць-чытаць-чытаць, а многія рэчы нават перачытваць па некалькі разоў. Каб паглыбіцца ў сутнасць напісаных сэрцам радкоў, яе вачыма паглядзець на тое, што адбываецца вакол, перажыць яе боль, яе радасць, адчуць яе каханне, шчасце і яе ж успрыманне здрады, падману і іншага негатыву.

*Встречать любовь по-новому хочу.*
*Откосы то крутые, то пологие...*
*Убеждена, что тоже научусь*
*водить успех тернистыми дорогами.*

*Удачи не слагаются нечаянно.*
*Проникнусь уважением к ошибке.*
*Ночь напролёт в блокнот*
*текло отчаянье.*
*Я знаю, всё закончится улыбкой.*

Я памятаю яе ўсмешку, калі мы сустрэліся ўпершыню. За вокнамі рэдакцыі гарадской газеты «Пінскі веснік» шумела лета. Было сонечна і цёпла. Нехта з супрацоўнікаў, зазірнуўшы ў мой кабінет, сказаў, што на вуліцы мяне чакаюць. Выйшаўшы, сустрэлася з адкрытым ветлівым позіркам вялікіх блакітных вачэй, прамяніста ўсмешлівых. «Наталля Прыступа», — прадставілася дзяўчына. Я прапанавала перайсці ў цянёк высокага дрэва, якое расце каля нашага будынка, і прысела на лаўку. Наташыну інвалідную каляску ўладкавалі побач. І пацякла

Каб не бянтэжыць суразмоўніцу, крадком разглядала яе. Пышныя светла-каштанавыя валасы ўкладзены ў прыгожую прычоску. Вочы і вусны акуратна падфарбаваныя. Дагледжанымі былі і яе маленькія пальчыкі з пазногцямі, афарбаванымі ў светла-ружовы. Такога ж колеру была і яе лёгкая блузка. Відаць, ад Наташы не схаваліся мае асцярожныя позіркі, але яна не сумелася, а проста заўважыла: «Выходзіць на людзі заўсёды трэба дагледжанай!» І прытрымлівалася гэтага прынцыпу да канца сваіх дзён.

Да завяршэння нашай гутаркі мы перайшлі на «ты», здавалася, што знаёмыя вельмі даўно. Сяброўства наша доўжылася да яе апошняга ўздыху.

Пасля першага паэтычнага зборніка ў 1997 годзе выходзіць другі — «Кляновае лісце», у 1998-м — «Быль», у 1999-м — «З любоўю», праз год — «Белы ўзмах» (у сааўтарстве з А. Мірчук), у 2004-м — «Два крылы». І нарэшце ў 2006 годзе — «У абдымках лёсу» (у сааўтарстве з В. Казакевічам). Амаль усе гэтыя зборнікі рэдагавала я, таму і змагла назіраць, як сталее, набірае сілы, імкнецца ўверх яе паэзія, каб у выніку заслужана называцца высокай. Мяне заўсёды захаплялі яе творчыя знаходкі, вывастраныя радкі, шырыня тэм, якія закранаюцца ў вершах, незабыўныя выявы і сюжэты. Толькі талент вышэйшай пробы дазволіў Наталлі сказаць аднойчы:

*Калаж Святланы Таргонскай.*




пачуццём трывогі. У раздзеле «У кучаравых снегападах» Наталля разам з іншымі размясціла і вершы-прысвячэнні блізкім ёй людзям: маці, бацьку, брату, яго жонцы, пляменніку, а таксама землякам і сябрам, прычым з фатаграфіямі тых, каму былі адрасаваны яе лірычныя радкі. Нібы прадчувала бяду і развіталася загадзя з усімі, хто ёй быў дарагі.

Я спрабавала разгаварыць яе, даведацца, што так трывожыць сэрца, хоць

Прыгожа, светла, нечакана, абнадзейліва.

Памяць не дазваляе забыць кранальныя і даверлівыя хвіліны нашых зносін з ёй. У сярэдзіне сёлетняй вясны ўсе яе сябры і прыхільнікі таленту віншавалі б Наталлю Прыступу з 65-годдзем. Не дажыла. Не дачакалася. Пайшла ад нас занадта рана.

**Марыя ЛЯШУК**
**Фота даслана аўтарам**